## ПАЛЕМІКА

# Ліст да спадара Сямёна Букчына

Здаўна я прыглядаўся да Вашай публіцыстыкі. Вельмі прыемна было знайсьці Вашу думку ў «Свабодзе» і «Нашай Ніве». Калі мне трапіў у рукі «ARCHE» № 5 (34), я прагна вышукаваў Ваша прозьвішча ў адказах на анкету. Але, на жаль, пасьля пары адказаў Вы зьбіліся на прыкрую лаянку. Вас абурае, што гэтыя, здавалася б, інтэлігентныя нацыяналісты не разумеюць элемэнтарнай схемы: сьпярша трэба «стварыць нармальнае жыцьцё, у якім годнае месца — не экзатычнае, а нармальнае — зойме нацыянальная мова». Складваецца ўражаньне, нібы Вы паднялі народ на стварэньне «нармальнага жыцьця». А тут уварваліся нацыяналісты са сваім «Законам аб мовах» і такім чынам «прайгралі краіну, будучыню». Я ня бачу залежнасьці між нармальным жыцьцём і разумным стаўленьнем да мовы. Гэта як у показцы. Прапаршчык зьвяртаецца да інтэлігентаў: «Если вы такие умные, почему же строем не ходите?» Бізнэсовец пераклаў гэту показку на свой капыл: «Калі вы такія разумныя, дык чаму такія бедныя?» Хрысьціянін сказаў бы: «Калі ты такі разумны, напісаў цэлую дысэртацыю па Бібліі, чаму ж у Бога ня верыш?» Ну а мне, апантанаму нацыяналісту, карціць спытацца так: «Шаноўны спадар Сямён! Калі Вы такі разумны, дык чаму да гэтай пары не перайшлі цалкам на беларускую мову?»

У разумным, годным, сытным жыцьці Амэрыкі ацалелыя мовы індыянаў займаюць «натуральнае» (прыроднае) месца рэзэрвацыі. Дарэчы, хачу яшчэ спыніцца на слове «натуральнае», якое Вы ўжываеце. Яно занадта шматсэнсавае, каб ім штосьці тлумачыць. Напрыклад, я яго прачытваю як «пануючае», «нармалёвае» месца для беларускай мовы. Але ж вы ўкладалі ў гэтае слова свой сэнс — натуральны выбар чалавека размаўляць без прымусу на той мове, на якой лічыць патрэбным. Але азірніцеся навокал — выбар зроблены, наша мова ўжо сёньня займае «натуральнае» месца. І дзеля гэтай мэты адпадае патрэба стварыць «годнае, чалавечае жыцьцё». Я ўжо цяпер — у гэтай нягоднай краіне — размаўляю толькі па-беларуску. А Вы ня будзеце так размаўляць нават забіўшы апошні цьвік у будаўніцтве раю на Беларусі. Ці ня так?

# Ліст да спадара Данілы Жукоўскага

Мне блізкая Ваша пазыцыя ў дыскусіі зь Юр'ем Дракахрустам («ARCHE» № 5). Бо я — нацыяналіст. Але Вы пацьвердзілі словы свайго апанэнта, што «беларускі нацыяналізм гаворыць па-расейску».

Калісьці на пачатку 80-х мінулага стагодзьдзя ў нас на «Майстроўні» таксама былі дыскусіі — на якой мове размаўляць. Вінцук Вячорка прапанаваў быў такую сытуацыю, калі можна і нават трэба перайсьці на расейскую мову. Ты ляжыш на рэйках, на цябе нясецца цягнік. Адзінае, што яго можа спыніць — гэта расейская мова з тваіх вуснаў. Дык не марудзь, хутчэй прамаўляй ды заставайся жывым! З тых пор ужо 20 гадоў я пераконваюся ў Вінцуковай рацыі — сапраўды, такіх сытуацыяў у жыцьці не бывае. За гэты час я бачыў розныя адносіны да мовы: і спагадныя, і пару разоў варожыя. Але ніколі (за выключэньнем службы ў савецкім войску) не было патрэбы пераходзіць на расейскую мову. Ніколі.

Мяне зьдзіўляе пазыцыя маладога пакаленьня. Пакаленьня, якое ў шушкевіцкую адлігу навучалася ў школе, выдатна авалодала беларускай мовай і не гаворыць ёю. Адзін юнак у пэўным сэнсе адказаў на гэтае пытаньне. Было гэта, калі мы рыхтавалі чарговы пленэр «Lehiendy ź piasku». Я сабраў быў хлопцаў і тлумачыў ім найсьвяцейшую мэту, што трэба абараняць родную мову. Міма праходзіла прыгожая дзяўчына. Адзін з маіх хлопцаў адхіліўся ад нас і пайшоў да яе знаёмцца, прычым па-расейску, як я пачуў здалёк.

— Чаму па-расейску? — пытаюся.

— Ну як чаму? — кажа, хаваючы вочы. — А раптам яна не захацела б са мной, беларусам, знаёміцца і...

— І абарваўся б твой род ня зямлі. Што ж, гэта высокая прычына, каб пакінуць мову нашу беларускую.

Спадар Даніла! Вы таксама размаўляеце на роднай мове ў мінімальным аб'ёме. Можа, Вам ня цяжка было б распавесьці мне пару тыповых выпадкаў з Вашага асабістага жыцьця (з той часткі, якую можна было б назваць «максымальным аб'ёмам»), калі маўленьне па-беларуску пагражала Вашаму жыцьцю, здароўю, кашальку ці якімсьці іншым вышэйшым каштоўнасьцям, дзеля ўратаваньня якіх Вы былі вымушаныя перайсьці на расейшчыну.

Ну што, знайшлі такі выпадак, калі была патрэба і магчымасьці, каб зьнішчыць родную мову? Значыць, такі факт сьведчыць толькі пра адно — беларуская мова мае патрэбу і магчымасьць быць зьнішчанай. Навошта тады дыскусія з Дракахрустам? Напэўна, дзеля таго, каб шчыра выказаць мне спачуваньні з нагоды немінучай сьмерці маёй беларускай мовы. Бо для Вас яна ня ёсьць сьвятыняю безумоўнаю.

Прынамсі, у адным я згодны з Дракахрустам — вайна ідзе (калі хочаце, называйце гэта канкурэнцыя, асыміляцыя ці інш.). Мая Вам парада: не вылазьце на бруствэр, там і свая куля можа зачапіць, а займіце ясную баявую пазыцыю ў акопе.

*Гэнік Лойка*